120-letiju-narodnogo-pisatelja-belarusi-kondrata-krapivy-183791-2016/. – Дата доступа: 27.02.2024.

***Я.А. Балдзін,***
*студэнт ФФБС БДЭУ*
*Навуковы кіраўнік – к.гіст.н. М.М. Кароль*

# БЕЛАРУС УЛАДЗІМІР АНІЧЭНКА – УДЗЕЛЬНІК ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ Ў ЧЭХАСЛАВАКІІ Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

У краінах былога Савецкага Саюза абсалютна кожная сям'я прыняла ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне. Хтосьці рабіў зброю і боепрыпасы, а хтосьці гэтымі боепрыпасамі абараняў нашу Радзіму. Так і я ганаруся сваёй сям'ёй, таму што яна прыняла ўдзел у гэтай вайне. Мой аповед быў напісаны на аснове кнігі «Повязі лёсу». Гэта кніга – аўтабіяграфія майго прадзеда Анічэнкі Уладзіміра Васільевіча.



Уладзімір Васільевіч Анічэнка нарадзіўся ў мнагадзетнай сялянскай сям’і ў вёсцы Янаўка Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці 20 ліпеня 1924 г. Летам 1941 г., напярэдадні вайны, ён закончыў Хоцімскую сярэднюю школу. У пачатку вайны ўдзельнічаў у эвакуацыі калгасных коней на ўсход, у Расію. Калі вярнуўся дамоў, вёску ўжо занялі немцы. Уладзімір Васільевіч быў арыштаваны і адпраўлены ў Магілёўскі канцлагер, адкуль ён уцёк разам з сябрам Міколам. Па дарозе дамоў іх зноў арыштавалі і вывезлі на прымусовыя работы ў судэцкі горад Мост (Чэхія), дзе іх чакала катаржная праца на шахце, падчас якой яго не пакідала думка пра пабег. І Уладзімір з Міколам і чэхам Юрыем, схаваўшыся ў ваганетцы з вуглём, уцяклі з шахты. Пасля доўгага блукання з дапамогай мясцовых жыхароў яны трапілі ў Арліцкія горы, дзе разам з іншымі вязнямі стварылі партызанскі атрад «Эда», у якім і змагаліся з фашыстамі да канца вайны. На фатаграфіі мы можам убачыць Уладзіміра Васільевіча з тым самым чэхам Юрыем у пасляваенны перыяд. У 1945 г. мой прадзед быў узнагароджаны чэхаславацкім нагрудным знакам партызана.

Пасля вайны Уладзімір Анічэнка старанна пагрузіўся ў вучобу – на працягу 1947–1952 гг. быў студэнтам філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У.І. Леніна, які закончыў з дыпломам з адзнакай, потым стаў аспірантам Інстытута мовазнаўства імя Я. Коласа Акадэміі навук БССР.

У 1955 г. мой прадзед абараніў кандыдацкую дысертацыю «Гісторыя форм прошлага часу ў беларускай мове па матэрыялах Літоўскай метрыкі XV–XVI стст.» (навуковы кіраўнік – дацэнт А.Я. Бірыла). Працаваў малодшым, а потым старшым навуковым супрацоўнікам Інстытута мовазнаўства. Займаўся ўкамплектаваннем інстытуцкай бібліятэкі рэдкімі рукапіснымі і друкаванымі помнікамі старабеларускага пісьменства. З 1970 г. Уладзімір Васільевіч працуе загадчыкам кафедры спачатку рускай і беларускай моў, а затым – беларускай мовы Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта. З 1991 г. па 2001 г. быў прафесарам кафедры беларускай мовы і загадчыкам лінгвістычнай лабараторыі пры навукова-даследчым сектары ўніверсітэта. Выхаваў больш за 20 кандыдатаў і дактароў навук. У апошнія гады свайго жыцця Уладзімір Анічэнка займаўся падрыхтоўкай да выдання рукапісу «Царкоўнаславянска-беларускага слоўніка», які не быў апублікаваны. Мой прадзед меў шэраг ганаровых званняў – быў узнагароджаны медалём Францыска Скарыны (1996 г.), Ордэнам Сергія Раданежскага, Ордэнам Вялікай Айчыннай вайны II ступені (1985 г.) [1]. У музеі Вялікай Айчыннай вайны вісіць яго партрэт. Таксама яго мемарыяльная дошка знаходзіцца каля Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта [2]. Памёр Уладзімір Васільевіч у 2001 г. Вельмі шкада, што лёс не даў магчымасць мне пабачыцца з ім.

**Літаратура:**

1. Список награжденных медалью Франциска Скорины [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.awards.by/nagrazhdenija/medal-franciska-skoriny. – Дата доступа: 09.03.2024.

2. Аниченко Владимир Васильевич [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://libmogilev.by/linguists/anichenko-vladimir-vasilyevich/. – Дата доступа: 09.03.2024.

***К.Л. Бобыш,***
*студент ФЦЭ БГЭУ*
*Научный руководитель – м.пед.н. О.П. Гуминская*

## BELARUSIAN DISHES WITH JEWISH FLAVOR. GASTRONOMIC DIPLOMACY

The basic premise of gastronomic diplomacy says: «the easiest way to win the hearts and minds of people – through the stomach». Since ancient times people began to notice that the most favorable and balanced decisions are made on a full stomach, so all negotiations or meetings were held at a table full of food. And this is really true, because when a person is fed, he feels happy and calm, and therefore is inclined to make contact and accept other people's point of view. This is how gastronomic diplomacy slowly began to emerge.